# Распараджэнне

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

8 студзеня 2025 г. № 1рп г.Мінск

Аб падтрымцы культуры і мастацтва

1. Зацвердзіць рашэнне савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва (дадаецца).

2. Міністэрству культуры выдзеліць у 2025 годзе са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва 6 000 000 рублёў на ажыццяўленне выплат у адпаведнасці з рашэннем, указаным у пункце 1 дадзенага распараджэння.

3. Кантроль за мэтавым выкарыстаннем сродкаў, выдзеленых згодна з пунктам 2 дадзенага распараджэння, ускласці на Камітэт дзяржаўнага кантролю і Міністэрства культуры.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ • 1 •
Для правовых актов

10

ЗАЦВЕРДЖАНА

Распараджэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
08.01.2025 № 1рп

РАШЭННЕ

савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва

18 кастрычніка 2024 г. пратакол № 2 г.Мінск

Выдзеліць:

па хадайніцтве рэспубліканскага рэлігійнага аб'яднання "Беларуская Праваслаўная Царква" рэлігійнай арганізацыі "Свята-Успенскі Жыровіцкі стаўрапігійны мужчынскі манастыр в.Жыровіцы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці Беларускай Праваслаўнай Царквы" на правядзенне работ на аб'екце "Рэстаўрацыя і кансервацыя іканастаса Успенскага сабора ў складзе гісторыка-культурнай каштоўнасці міжнароднай значнасці Свята-Успенскага манастыра ў аг.Жыровіцы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці" за кошт адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; кампенсацый за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; бязвыплатнай (спонсарскай), у тым ліку замежнай, дапамогі, ахвяраванняў; іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры – 1 000 000 рублёў;

установе "Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь" на правядзенне работ на аб'екце "Рэстаўрацыя і прыстасаванне адзінага комплексу будынкаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. 2-і пускавы комплекс" за кошт адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; кампенсацый за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; бязвыплатнай (спонсарскай), у тым ліку замежнай, дапамогі, ахвяраванняў; іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры – 5 000 000 рублёў.

Старшыня савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва — Н.У.Карчэўская